ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
26
МАЯ
№ 18 (1576)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

У наступным нумары чытайце

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

• УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА •

### АБ АРГАНІЗАЦЫІ АЗДАРАЎЛЕННЯ

і адпачынку студэнтаў у перыяд летніх канікулаў ішла размова на апошнім пасяджэнні прэзідыума студэнцкага прафкома. Свае меркаванні па гэтаму пытанню выказаў старшыня прафкома А. Д. Кішкевіч. Былі таксама разгледжаны прапановы па аздараўленню дыспансерных хворых.

Шмат недарэчнасцей заўсёды ўзнікае ў інтэрнатах пры рассяленні. І каб не было непаразуменняў, пытанне аб размеркаванні месц у інтэрнатах сярод факультэтаў на 1988—89 навучальны год было вынесена на абмеркаванне на пасяджэнне прэзідыума, дзе прадугледжаны таксама парадак засялення у іх.

А. МАРОЗАЎ.

### У РАМКАХ ФЕСТЫВАЛЮ

«Альтэрнатыва-88», які праводзіць Рэспубліканскі маладзёжны музычны цэнтр «Арыенцір», пройдзе канцэрт бардаў (27—29 мая, Палац культуры прафтэхадукацыі). У ім прымуць удзел У. Бобрыкаў (г. Мінск) — удзельнік фестывалю «Парад надзей-88», А. Кучумаў (г. Ленінград) — лаўрэат І Ленінградскага тэлеканцэртнага фестывалю, радыёканцэрта «Неўская хваля» і ІІ Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, а таксама В. Вацякоў (г. Ленінград). Дарэчы, ён не мае такіх высокіх тытулаў, як два першыя ўдзельнікі, але яго «паўночныя» песні, у якіх раскрываюцца сацыяльныя праблемы, негатыўныя бакі нашага жыцця, прыйшліся даспадобы тым, хто яго чуў.

Д. ЛУКАШУК.

### «КАША З ЖУРАВІН, АБО СКАНДАЛ У ГІМАЛАЯХ»

— так называўся спектакль, які па шматлікіх просьбах студэнтаў паўтарылі фізфакаўцы (самадзейныя артысты паказвалі яго на днях фізіка).

На працягу дзвюх гадзін паміж артыстамі і гледачамі была атмасфера поўнага ўзаемаразумення. На сцэне ішло звычайнае жыццё ў імправізаваным універсітэце, што размясціўся ў невялічкай вёсцы Бамбеевічы. Сцэнічнае жыццё цесна перапляталася з сапраўдным.

Артысты-аматары знаходзілі гарачую падтрымку ў гледачоў, якія часта разрывалі цішыню гучным смехам, гарачымі апладысментамі. Іх, безумоўна, таксама хвалявалі праблемы студэнцкага жыцця, якія ўзнімалі ўдзельнікі спектакля.

Г. ШАЎЦОВА.



АДУКАЦЫЯ: ЯКОЙ ЁЙ БЫЦЬ

## ІДЭІ І ВУЧНІ

Аб праблемах адукацыі, яе заўтрашнім дні не сціхаюць дыскусіі і цяпер, калі прайшла рэарганізацыя яе чыноўніцкіх апаратаў і, здаецца, усё пачынае «раскладвацца па паліцах». Адны вядуць гаворку ў песімістычным тоне: «Дзе абяцаная канцэпцыя непарыўнай адукацыі?» Другія вітаюць адзінаначалле ў нарасветаўскай сістэме, прымаючы яе як панацэю... А школа тым часам — і сярэдняя, і вышэйшая — заканчвае чарговы навучальны год. Што абнадзейлівага прынёс ён? Што па-ранейшаму трывожыць? Якое месца ў перабудове вызначылі для сябе тыя, хто вучыць, і тыя, хто вучыцца?

Гэтыя пытанні сталі тэмай нашай гутаркі з рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна акадэмікам Леанідам Іванавічам КІСЯЛЕЎСКІМ. Дарэчы, па водгуках студэнцтва, самым дэмакратычным рэктарам рэспублікі.





— КАЛІ б я быў міністрам... дырэктарам... рэктарам...— адно з любімых журналісцкіх пытанняў субяседніку. Вельмі зручнае: дапамагае вызначыць накіраванасць і шырыню грамадскіх інтарэсаў чалавека. Прабачце, Леанід Іванавіч, але ў пытанні, якое я задам Вам, камплімэнтарных намёкаў якраз не будзе: калі б акадэмік Кісялеўскі не быў рэктарам БДУ, як бы ён ацаніў сённяшняе становішча спраў ва універсітэце?

— Неардынарнасць патрабуе шчырасці,? вясёлая ўсмешка рэктара ўсталёўвае кантакт супрацоўніцтва.— Паспрабую быць аб'ектыўным... Хаця, адчуваю, наўрад ці ўдасца: як можна быць аб'ектыўным да таго, што любіш, песціш, да чаго прырос? Але... Белдзяржуніверсітэт лічыцца флагманам, вядучай вышэйшай навучальнай установай рэспублікі па інерцыі. Па сваёй базе наша вядучая альма-матэр даўно стала сераднячком. Асабліва ў незайздросным становішчы гуманітарныя і прыродазнаўчыя факультэты: на філалагічным факультэце, напрыклад, заняткі ідуць у тры змены. А месца, прызначанае для левага «крыла» БДУ, заняў офіс Мінскага метрапалітэна.

Заканчэнне на 2 стар.

— Дарэчы, чаму вы заўсёды прапануеце толькі чытаць,— запытаўся неяк студэнт геафака, зірнуўшы адным вокам на газетную паласу.

А нам здалося, што газету ён бачыць рэдка, таму і не ведае, што амаль у кожным нумары супрацоўнікі рэдакцыі прапануюць тэмы для абмеркавання. Рэкардсменам стала падборка «Пабудуем сонечныя людзям гарады», атрымаўшы тры водгукі. Такіе вынікі нас не задавальняюць. А вас?

Таму запрашаем усіх, каму ёсць аб чым расказаць, на што паскардзіцца, што прапанаваць да размовы. «Я. Ты. Наша група.» Вашы лісты апублікуем у адным з бліжэйшых нумароў. Так што, У НАСТУПНЫ НУМАР ПІШЫЦЕ.

РАХУНАК № 703М

## Шукаем ініцыятыўных

Не так даўно рэдкалегія насценнай газеты «Vita» выступіла з заклікам пералічваць грошы ў фонд заасада, на рахунак № 703 М. За красавік-май дзякуючы біяфакаўцам ён папоўніўся амаль на 400 рублёў. Сярод укладчыкаў хацелася б адзначыць М. Аляхновіча, Т. Сауткіну, А. Давыдзёнак, якія ўнеслі па дзесяць і больш рублёў.

А сакратар камітэта камсамола біяфака С. Рубахін прапанаваў усе грошы, зробленыя студэнтамі-біёлагамі ў гэтым годзе на суботніках у вучэбнай гаспадарцы «Шчамысліца», таксама пералічыць у фонд заасада. Ініцыятыву, безумоўна, падтрымалі.

На рахунак № 703 М былі пералічаны і ўсе грошы, выручаныя на Днях біяфака ад продажу так званых антыкварных рэчаў.

Спытаеце: для чаго мы пра ўсё гэта пішам? З надзеяй на тое, што і на іншых факультэтах знойдуцца тыя, хто любіць жывёл, і падтрымаюць нашу ініцыятыву.

Ю. РАБАЎ,
А. ВАЖДЗЕЎ,
студэнты біялагічнага факультэта.

ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА: ШЛЯХІ ПЕРАБУДОВЫ

## Навучыць... вучыцца

Навучыць маладых людзей вучыцца, працаваць, стварацць у вучню студэнта, красамоўна гаворачы, крытычную масу ведаў і навыкаў, здольную да самаразвіцця ў працэсе далейшай адукацыі — у гэтым заключаецца адна з важнейшых задач, якая была вылучана на лютаўскім (1988 г.) Пленуме ЦК КПСС.

Як ажыццяўляюцца пераўтварэнні? З гэтым пытаннем наш няштатны карэспандэнт звярнуўся да выкладчыкаў і студэнтаў факультэта журналістыкі.

Р. В. БУЛАЦКІ, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, доктар гістарычных навук:

— На кафедры гісторыі журналістыкі вядзецца сур'ёзная, зацікаўленая размова аб перабудове ўсёй педагагічнай работы, высокія патрабаванні прад'яўляюцца да падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. І курс «Гісторыя партыйна-савецкага друку» вельмі спрыяльны з пункту гледжання выхаваўчай работы сярод будучых супрацоўнікаў рэдакцый. Ён змяшчае ў сабе вялікія магчымасці па фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду будучых журналістаў, іх ідэйна-эстэтычных поглядаў, прафесіянальнага майстэрства. На прыкладзе каласальнай работы У. І. Леніна ў друкаваных органах дакастрычніцкага і савецкага перыядаў выкладчыкі нашай кафедры імкнуцца дапамагчы студэнтам зразумець, што журналісцкая прафесія патрабуе сур'ёзнай, дзелавой, складанай работы.

— Што новага ўнесла рэформа ў метад выкладання на факультэце?

— На факультэтах і аддзяленнях журналістыкі краіны найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца два спосабы выкладання: тлумачальна-ілюстрацыйны і праблемны, які ў апошні час інтэнсіўна развіваецца. Пры традыцыйным навучанні выкладчыкі карыстаюцца агульнапрынятым метадам чытання лекцыі ў адпаведнасці з праграмай таго ці іншага курса. Пры праблемным чытанні патрабуецца другое — неабходна вызначыць канкрэтны, актуальны аспект тэмы — ён можа быць тэарэтычным ці практычным.

Пасля абмеркавання праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі вышэйшай і спецыяльнай адукацыі» быў здроблены акцэнт на ўкараненне ў вышэйшых навучальных установах праблемных лекцый як эфектыўнага метаду навучання, што спрыяе якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

— Якія рэзервы для ажыццяўлення рэформы ёсць у нас?

— На факультэце вядзецца пошук аптымальных варыянтаў лекцый, дзе б дасягалася разумовае спалучэнне фактычных даных і тэарэтычных абагульненняў, гістарычнага і сучаснага матэрыялу. Мы прытрымліваемся той думкі, што на цяперашнім этапе навучання журналістаў у вышэйшай школе ў лекцыйных курсах павінен пераважаць праблемны падыход над падзейна-фактычным, інфармацыйна-тлумачальным. У дапамогу студэнтам выкладчыкі нашай кафедры стварылі шэраг дапаможнікаў, кніг аб творчасці беларускіх публіцыстаў, а таксама публіцыстаў ленінскай школы.

А вось пункт гледжання студэнтаў аб ходзе рэформы.

КОЛХА РАІДА, студэнтка IV курса аддзялення міжнароднай журналістыкі (Сірыя).

— Пастанова адпавядае маім уяўленням аб рэформе ў тым плане, што яна надае вялікую ўвагу зместу і метадам навучання і выхавання. Ці адчуваем мы дух перабудовы? Колькасць практычных заняткаў павялічылася, вялікія магчымасці адкрываюцца ў студэнтаў з увядзеннем творчых дзён, калі студэнт можа ў працы правяраць тыя веды, якія ён атрымаў на лекцыях.

Т. ХУДОБА, ІІ курс.

— Бясспрэчна, у апошні час на факультэце адчуваюцца змены, асабліва ў вучэбным працэсе. Важную ролю тут, на мой погляд, адыгрывае работа адміністрацыі. А хацелася б, каб і студэнтам давалася большае права ўносіць свае карэктывы. З улікам матэрыялаў лютаўскага (1988 года) Пленума ЦК КПСС, думаю, неабходна звярнуць увагу на эстэтычнае выхаванне моладзі.

КУАБІЯ АБДУЛЛА, студэнт аддзялення міжнароднай журналістыкі.



# Паклон табе, Вязынка!



І вось новы злёт філолагаў. На былым месцы сустрэчы. Праўда, на гэты раз прысутнічаюць не толькі прадстаўнікі філфака, і госці з Кіеўскага, Кішынёўскага, Вільнюскага універсітэтаў таксама.

Свята як свята. З песнямі, музыкай, народнымі танцамі, вершамі і... крыху сапсаваным настроем. Таму што некаторыя нумары праграмы добра падрыхтаваць не паспелі.



Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# ІДЭІ І ВУЧНІ

*Заканчэнне.*
*Пачатак на першай старонцы.*

Парадокс! Які раскрыў сутнасць нядаўніх яшчэ адносін да адукацыі ўвогуле і вышэйшай навучальнай установы, «вядучай» у рэспубліцы, у прыватнасці.

Апошні час,— канстатую гэта не без шчырага задавальнення,— прынёс сур'ёзныя папраўкі ў разуменне задач, якія стаяць перад сярэдняй і вышэйшай школай. Прынята пастанова (трэцяя па ліку, але самая канкрэтная па зместу) па развіццю Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Апіраючыся на яе грунтоўнасць і дакладнасць, магу сказаць, што да 1995 года наш універсітэт сапраўды стане вядучай вышэйшай навучальнай установай рэспублікі. У студэнцтва нарэшце з'явіцца свой гарадок, зручныя аўдыторныя і лабараторныя корпусы, інтэрнаты. Адкрыецца НДІ ядзерных праблем. Перспектыва цудоўная і, галоўнае, не аддаленая часовымі рамкамі: будаўніцтва распачата.

**— Нам, выпускнікам БДУ «гадоў застою», застаецца пазайздросціць малодшым братам-студэнтам. Але мы закранулі толькі праблемы матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. Як, на Вашу думку, суадносяцца вышэйшая адукацыя і патрабаванні навукова-тэхнічнага прагрэсу? Як выйсці з гэтых супярэчнасцей?**

— Меркаванне аб тым, што сённяшні ўзровень спецыяльнай і агульнакультурнай падрыхтоўкі выпускнікоў ВНУ не адпавядае патрабаванням часу, даўно не прэтэндуе на адкрыццё. Але давайце не будзем абсалютызаваць: ёсць жа ў нас маладыя талковыя канструктары і інжынеры, хірургі-віртуозы... карацей, уласныя Платоны і Ньютаны. І усё ж, усё ж... у нашага сярэднестатыстычнага выпускніка (універсітэта, інстытута) часцей за ўсё прафесіянальны твар невыразны. Паверце: не ад таго, што сам па сабе малады чалавек — невыразная асоба! Гэтую невыразнасць выхавалі ўстаноўкі і «традыцыі» (менавіта ў двукоссі!) родных школ — спачатку сярэдняй, потым старэйшай сястры — вышэйшай. Якія да апошняга часу былі туга спавіты інструкцыямі і рэкамендацыямі. Даўно мы зразумелі, што так, як нам рэкамендуюць, вучыць не трэба. Так, як трэба — не рэкамендуюць. Сёння — я ўжо гаварыў — справы іншыя. Вышэйшая школа разнявольваецца ад бяздумнага прытрымлівання бяздумных планаў і праграм, навязаных чыноўнікамі ад адукацыі. Сёння мы да дваццаці працэнтаў навучальнага плана вызначаем самастойна. Уводзім адпавядаючыя часу спецкурсы і дысцыпліны, спецыялізацыі і спецыяльнасці. Без узгаднення з міністэрствам! Нядаўна адбылася ў нас сустрэча з кіраўніцтвам вытворчага аб'яднання «Інтэграл»: па іх просьбе рыхтуем спецыялістаў па матэматычнай электроніцы. Шмат заявак на спецыялістаў па робататэхніцы, і мы, разумеючы патрэбы вытворчасці, будзем выконваць іх заяўкі. У нас цяпер ёсць такая магчымасць! Вось Вам і збліжэнне «акадэмічнага» універсітэта з патрэбамі жыцця. Жывіць гэту разумную тэндэнцыю будзе ўзаемны інтарэс вытворчасці і ВНУ. Гэта значыць: мы прапануем вытворчасці кваліфікаванага спецыяліста, вытворчасць нам — матэрыяльна-тэхнічную базу для яго падрыхтоўкі. Упэўнены, калі эканамічны стымул у адукацыі атрымае развіццё, узровень яе будзе непарыўна расці.

**— Не ў піку, а паралельна з «матэрыяльным», прыгадваецца меркаванне Мікалая Іванавіча Вавілава аб тым, што ўдзельная вага навукі вызначаецца не толькі сродкамі, якія адпускаюцца па дзяржбюджэту, але перш за ўсё кругаглядам вучоных, вышынёй іх навуковага палёту. Леанід Іванавіч, як вызначыце Вы навуковы патэнцыял выкладчыкаў універсітэта?**

— Разумею ход Вашай думкі: сфарміраваць класнага спецыяліста пад сілу толькі высокаадукаванаму, па-сапраўднаму захопленаму навукай, педагагічна адоранаму вучонаму. Канешне! Што можа даць студэнту выкладчык, калі ён не ў стане ўнесці ў навуку асабісты ўклад! Выкладчыцкі корпус БДУ сёння моцны і прадстаўнічы. Але мы... не задаволены. Хацелася б бачыць настаўнікамі нашых студэнтаў дактароў навук, прафесараў. А ў нас тэндэнцыя старэння кадраў, кепска... Асабліва трывожнае становішча на юрыдычным факультэце, у журналістаў: амаль уся прафесура — пенсіённага ўзросту.

Мы прааналізавалі прычыны, але, мяркую, не варта перакладваць іх на «плечы» аб'ектыўных абставін. І наша недапрацоўка тут ёсць. Ці мала ва універсітэце выкладчыкаў — кандыдатаў навук, якія, трывала «абкатаўшы» свой лекцыйны курс, задаволіліся пасадай дацэнта? Не растуць як навукоўцы, а, значыць, не могуць весці наперад студэнтаў.

Дактарантура, якая будзе адкрыта пры універсітэце, створыць умовы навуковага росту тым, хто да яго імкнецца. Больш пільна мы прыглядаемся і да кандыдатаў у аспіранты. Не сакрэт, яшчэ ўчора ў навуку было зялёнае святло слабым спецыялістам. Зноў парадокс: на шалі вагаў клаліся паперкі са сталічных ЖЭСаў, а не цвяроза абгрунтаваная надзея на навуковую аддачу.

Уяўляеце, рэктарат не мае права пакінуць у горадзе нават талентавітага выпускніка аспірантуры, калі ў яго пашпарце адсутнічае штамп мінскай прапіскі. Талент едзе ў Хоцімскі раён ці Чашніцкі і, як правіла, растварaецца ў сельскіх буднях. Так, сельскай школе патрэбны Шаталавы і Шчацініны! Але чалавек, якому ёсць што прынесці навуцы, павінен рэалізаваць сябе. І мы павінны прадаставіць яму гэтае права! Нарэшце, Акадэмія навук БССР дабілася дазволу прымаць на работу выпускнікоў ВНУ і аспірантуры і немінчан. Трэба зрабіць наступны крок — дазволіць гэта і ВНУ.

А з Акадэміяй навук у нас пачынаюць складвацца сапраўды партнёрскія адносіны. Мы прыйшлі да рэальнага ўзаемадзеяння — праз навучальна-навуковыя аб'яднанні. Ёсць яшчэ адна ідэя: з першых курсаў вылучаць самых адораных юнакоў і дзяўчат, навучаць па спецыяльных праграмах з тым, каб за пяць універсітэцкіх гадоў максімальна падрыхтаваць да работы ў навуцы. Але гэтыя групы не будуць «вышэйшымі кастамі»: увайсці ў яе можа кожны. Адно патрабаванне— дакажы, што здольны. І адсеў, вядома, будзе непазбежны — калі не засвойваеш ускладнёную праграму, давядзецца вярнуцца ў звычайную групу.

Зрэшты, не з універсітэта нам трэба пачынаць адкрываць таленты. Так, у нас ёсць школы юных — хімікаў, фізікаў, матэматыкаў. Але, будзем шчырымі,— у Мінску, абласных цэнтрах. Вясковыя дзеці абдзелены. А, можа, сярод іх адораных не менш! Колькі разоў прапаноўваў адкрыць пры універсітэце школу-інтэрнат з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, фізікі і іншых дысцыплін (ёсць жа пры Белдзяржкансерваторыі музычная). Безвынікова!

**— У студэнцкім асяроддзі шмат спрэчак вакол дэмакратызацыі вышэйшай школы. Выкладчыкі больш стрыманы ў ацэнках. Скажам прама: многія хваравіта ўспрымаюць і студэнцкую лаўку на пасяджэннях вучонага савета і яе незалежныя думкі, не гаворачы ўжо пра анкетаванне «Выкладчык вачыма студэнтаў»...**

— Ва універсітэцкіх сценах павінна быць атмасфера навуковага супрацоўніцтва. І ні ў якім выпадку не школярства! Зарэгламентаваныя, мы перасталі ўспрымаць вышэйшую школу Вышэйшай. Навучанне замянілася зубрэннем. Павага да самастойнай думкі — патрабаваннем непахіснага аўтарытэту старэйшых. Пры такіх умовах выкладчык, да якога цугам ідуць студэнты, ды яшчэ з пытаннямі не толькі па лекцыі, — дзівак. Ну, а калі гэты прафесар дацямна сядзіць з юнакамі ў лабараторыі, і ў іх прыняты спрэчкі, чаяванні, чытанні вершаў,— відаць, марсіянін. Але чаму?! Мы ж усё разумеем: страсцю да ведаў можна заразіць толькі сваёй страсцю. Вернасцю навуцы —сваёй вернасцю. Не за год, не за два вырасла сцяна адчужэння паміж выкладчыкам і студэнтам. І пасля загаду рэктара яна не разбурыцца.

**— Леанід Іванавіч, згадзіцеся,— калі ва універсітэце (інстытуце, вучылішчы) «чытаюць» толькі курс навучальных дысцыплін, а прыкладаў сапраўднай інтэлігентнасці не так многа,— як патрабаваць яе ад учарашняга выпускніка (кіраўніка хаця і ніжэйшага, а рангу)? Як крытыкаваць за раўнадушша, калі яму ж вучылі?**

— Таму мы і прынялі праграму гуманітарызацыі адукацыі. Зразумелі, што этыцы месца не на перыферыі вышэйшай адукацыі, а ў цэнтры. Мы павінны навучыцца самі — і іншых навучыць — глядзець на чалавека як на галоўную каштоўнасць. Не камандаваць, а ўплываць асабістымі ведамі, прыкладам. Гейнэ пісаў: «Адзін алмаз паліруе другі. Гэтак жа і філасофія Дэкарта ні ў якім выпадку не нарадзіла філасофію Спінозы, а толькі садзейнічала яе з'яўленню». Так і ёсць...

Нядаўна давялося пабываць у ЗША. Прыглядаўся, як пастаўлена справа ў іхніх універсітэтах. І вось што карыснае адзначу: з першага па апошні курс за кожным студэнтам замацаваны выкладчык, «шэф». «Шэф» адказвае за свайго выхаванца ў поўным сэнсе слова «адказваць»: ведае, дзе той, з кім, навошта. Раз у тыдзень — сустрэча, гутарка, як мы гаворым, па душах. Ад старэйшага — не павучанні. Не кіслая фізіяномія пры навінах яўна непрыемных. Уважлівасць. Тактоўнасць. Аптымізм. Вось і нам неабходна выпрацаваць новыя формы ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнта. З дапамогай педагагічнай навукі.

**— Пытанне аб сённяшніх камсамольскіх важаках. Як Вы ставіцеся да таго, што студэнцкая група ведае лепшага брэйкера курса, і зусім не — свайго камсамольскага лідэра?**

— Адношуся спакойна: моладзь сама павінна разабрацца ў сваіх прыхільнасцях. І выбраць — сапраўднае, а не эрзац. Ну, а камсамольскія важакі розныя бываюць. Калі не здольны павесці за сабой, значыць, не важакі. У нашым камітэце камсамола, на маю думку, добрыя юнакі і дзяўчаты.

**— Леанід Іванавіч, а калі б Вам зараз было 20—22. Вы былі б актывістам?**

— Відаць, я б не ставіў перад сабой задачу перавыхаваць іншых. Я паставіў бы перад сабой пытанне: як новае ўплывае на грамадства, на ўсіх нас.

**— Калі ласка, прыгадайце сябе студэнтам.**

(Леанід Іванавіч Кісялеўскі скончыў БДУ імя У. І. Леніна ў 1952 годзе).

— Апрача вучобы, быў заўзятым спартсменам. За зборную універсітэта выступаў адразу ў трох камандах — лёгкаатлетычнай, баскетбольнай і валейбольнай... У тэатр часта «бегалі», мастацкай самадзейнасцю захапляліся... — задумваецца.— Высновай, цяпер разумею, была вялікая патрэбнасць быць разам, абмяркоўваць усё на свеце...

**— Тэорыя бяскрылага эрасу, наркаманія, п'янства. Што прадпрыняць, каб змясціліся акцэнты «захапленняў» моладзі?**

— У чалавека з дня нараджэння павінен быць ідэал. Маё пакаленне расло, прымерваючы на сябе подзвігі герояў толькі што адгрымеўшай вайны. Нам не трэба было расказваць, як нехта «ў нашы гады». Мы — ведалі. А сёння трэба паказваць жыцці, яркія асобы. Трэба даражыць імі. Складанае пытанне. Адказ на яго даўно шукаю...

**— Кім бы Вы сталі, калі б не былі рэктарам?**

— Вучоным. І абавязкова працаваў бы са студэнтамі.

Гутарку вяла
Вольга ГАЛУБОВІЧ.
(газета «Чырвоная змена»)

Усе пачыналі з «нулікаў». Як ні сумна было канстатаваць імі адсутнасць нумароў газет «Слова філолага» (філфак), «Мерыдыян» (геафак), «Імпульс» (факультэт радыёфізікі і электронікі), кожнаму з членаў камісіі давялося зрабіць гэта. Засталося толькі восем удзельнікаў агляду-конкурсу насценнага друку універсітэта.

Чакалі «традыцыйнай» спрэчкі за першае месца, якую вядуць ужо не адзін год «Журналіст» і «Vita». Не дачакаліся. Бо газета біяфака апынулася ў нашай рэдакцыі намнога пазней за іншыя (не ведаем, каго абвінавачваць: камітэт камсамола факультэта ці няспрытнасць саміх членаў рэдкалегіі) і падзяліла другое месца з газетай «Савецкі юрыст», якая ў мінулым годзе была трэцяй. На трэцім месцы, дзякуючы выдатнаму ўзроўню афармлення, газета «За навуку» (фізфак).

Чацвёртае-пятае месцы падзялілі «Алгарытм» (ФПМ) і «Гісторык» (гістфак). Па-ранейшаму на апошніх месцах «Рошым любую задачу» (мехмат) — VI і «Хімік» — VII.

Вынікі падведзены, арганізавана выстаўка нумароў лепшых газет, а ў сённяшнім завочным прэс-цэнтры мы вырашылі даць слова не толькі членам журы: абмеркаваць, параіцца, зрабіць вывады.

## НЕРАЎНАДУШНЫЯ НАТАТКІ

# ЧАСЦЕЙ ЗАЗІРАЙЦЕ Ў ЛЮСТЭРКА

НАВІНУ пачуць паспелі? «Беларускі універсітэт» будзе выходзіць зараз толькі па вялікіх святах! Наступны нумар — да першага верасня, не раней.

Здзіўляецеся? «А як жа? Чаму? Нашто?» — пытаецеся. Усё вельмі проста. Часам хочацца быць падобнымі на вас, члены рэдкалегій насценных газет. І толькі. Відавочна, так жыць лягчэй і зручней. Галоўнае, не патрабуе вялікага клопату і мукаў творчасці.

На самай справе — чаму так рэдка на многіх факультэтах выходзяць насценныя газеты? Толькі да свят. Няўжо ўсе цікавыя падзеі адбываюцца ў групах толькі напярэдадні гэтых дзён?

### А ВЫ І НЕ ВЕДАЛІ?

Аднойчы яны прапанавалі дэкану зірнуць на стан спраў на факультэце вачыма студэнта. У яго гэта зусім няблага атрымалася. Толькі... Успомніўшы свае студэнцкія гады, пажартаваўшы і пасумаваўшы, чамусьці не паспрабаваў ён затрымаць увагу на «вострых вуглах». Пры ўсёй павазе да часоў мінулых студэнты турбаваліся цяперашнімі праблемамі, і было ім не да жартаў. І тады вырашылі яны... сесці ў крэсла дэкана. Студэнтаў многа, крэсла адно. Як зрабіць так, каб нікога не пакрыўдзіць?

Гэта не гульня ў самакіраванне. Гэта сур'ёзная і карпатлівая праца, якую пачала рэдкалегія газеты «Журналіст», правёўшы анкетаванне студэнтаў «Калі б я быў дэканам». У лістах, запоўненых рознымі почыркамі,— розныя рэагаванні на прапанову выказаць свае думкі: скаргі і мары, глыбокі аналіз і жорсткі прысуд.

Дзіўная справа не тое, што каля нумара з апублікаванай анкетай сабраўся натоўп людзей (такое адбываецца заўсёды), а тое, што УСЕ ў перамены паверылі. У той жа час вы не сустрэлі б на факультэце раўнадушных позіркаў і абыякавых твараў, затое пачулі б на пасяджэннях вучонага савета, партбюро, прафкома: «як адзначалася ў газеце...»

І адказваць на пытанні, а таксама вырашаць іх давялося ўжо не толькі дэканату, але і многім выкладчыкам і студэнтам. Разумееце, што адбылося? Доўгі час існавалі невырашальныя (бо абмяркоўваліся толькі ў аўдыторыях і кабінетах) праблемы. А «Журналіст» зрабіўся цэнтрам адкрытых спрэчак, дыскусій, развагі, прапаноў.

Прапагандыст, агітатар, арганізатар. Гэта ўсё пра газету. Не пярэчце, што толькі пра цэнтральную, рэспубліканскую, шматтыражную. Пра насценную таксама. Магчыма нават у большай ступені. Таму што бліжэй за ўсіх стаіць яна да чытача. Яна (гэтаму спрыяе калектыўная творчасць і не толькі «вытворчыя», але і чалавечыя адносіны паміж членамі рэдкалегіі) можа стаць цэнтрам аб'яднання аднадумцаў, пачынальнікам многіх факультэцкіх спраў. Я не тэарэтызую, проста добра памятаю тэатралізаваныя прадстаўленні, падрыхтаваныя па ўласнай ініцыятыве членаў рэдкалегіі «Журналіста», і была сведкай таго, як на адным са справаздачна-выбарных камсамольскіх сходаў амаль усе загадчыкі аддзелаў і карэспандэнты газеты ўвайшлі ў састаў камітэта камсамола.

### ТОЛЬКІ ПАСПЯВАЙ РАСКАЗВАЦЬ

У многіх з вас выпрацавалася звычка ў пачатку тыдня наведваць камітэт камсамола, каб атрымаць неабходную інфармацыю: што, дзе, калі будзе? Між тым, магчыма, перш трэба зазірнуць у газету.

Толькі дзе яе знайсці, тую газету, у якой інфармацыйная насычанасць задавальняла б інтарэсы чытачоў?

Калі параўнаць з мінулым годам, газеты «упрыгожылі» твары. Зразумела: знайсці адзіны для ўсіх ідэал немагчыма. Ды і не трэба. Як і ў кожнага факультэта, у «насценак» свае задачы, мэты, сваё жыццё, свае здольнасці і цяжкасці. А галоўнае, свой пункт гледжання. Таму журы, якому спадабалася стрыманасць (як у сур'ёзнай газеце) чорна-белых палос «Журналіста», не магло не адзначыць цікавую знаходку рэдкалегіі «За навуку» па выкарыстанню каляровай паперы ў афармленні. У адрозненне ад «Алгарытма», дзе, здаецца, даўно не думаюць пра эстэтычны бок, «Рошым любую задачу», члены рэдкалегіі якой самі ўскладняюць сабе жыццё, ствараючы рукапісныя паласы, газета выглядае акуратна.

Што галоўнае — змест ці афармленне? Ідэальны варыянт, калі і з адным, і з другім усё будзе ў парадку. Цікавы змест, інфармацыйную насычанасць і праблемнасць матэрыялаў убачылі мы ў газеце «Савецкі юрыст», чым не можа пахваліцца газета «Хімік». Аляпаватасць і стракатасць ніколі не затрымаюць увагу чытача, калі замест паведамленняў і абмеркавання набалелых праблем яму будуць прапаноўваць рознакаляровыя малюнкі. Часта нерацыянальна выкарыстоўваюць газетную плошчу «Гісторык», «Рошым любую задачу», «Алгарытм».




Турбуе яшчэ вось што. На кожнай кафедры, кожным курсе, у кожнай групе адбываюцца штодзень здарэнні. Зразумела, з вышыні «вялікіх» газет здаюцца яны дробязнымі, не вартымі ўвагі. Але чытачоў «насценак» яны ад гэтага менш не турбуюць. Чаму ж мінаюць дробязныя канфлікты і праблемы члены рэдакцый?

А з нараканнямі на недахоп інфармацыі дазвольце не пагадзіцца. Яе можна шукаць не толькі на факультэтах — выходзьце на вуліцы, у кінатэатры, дыскусійныя клубы.

### ГЭТА ВЫ НЕ ПРАХОДЗІЛІ?

На хімфаку ці гістфаку, ФПМ ці мехмаце не чытаюць спецыяльных дысцыплін па журналісцкаму майстэрству. Дзе ж набрацца вопыту? Згаджаюся і прымаю вашы крытычныя заўвагі. Прэс-цэнтр, арганізаваны пры камітэце камсамола і рэдакцыі «Беларускага універсітэта», у апошні час амаль не працаваў. Не знайшлося ініцыятыўных памочнікаў сярод студэнтаў журфака, не змаглі мы прыдумаць новыя формы арганізацыі вучобы. І таму давайце думаць пра гэта ўсе разам.

Вы прайшлі міма насценнай газеты. Зазірнулі ў гэта люстэрка факультэта? Што ўбачылі? Падумайце, ці задавальняе вас змест, форма? Не? Не спяшайцеся наракаць на членаў рэдкалегіі. Гэта і ваша газета. Вы яе карэспандэнты. У ёй — і ваш твар. Таму зазірніце ўважліва і вырашыце самі, якой ёй быць.

Па даручэнню членаў камісіі
М. ЗАГОРСКАЯ.




## ТЫ МЯРКУЕШ, Я МЯРКУЮ

# «МЫ НЕ БАІМСЯ»

АДРАЗУ папрашу прабачэння за тое, што мала буду гаварыць пра газеты іншых факультэтаў, а больш — пра сваю.

Што датычыць выстаўкі. Гэта, безумоўна, добра. І для параўнання, і ў плане пераймання вопыту. Але, аналізуючы афармленне і змест матэрыялаў, часта прыходзіў да думкі, што газеты робяцца наспех, незапланавана. Іншы раз кінецца ў вочы прыгожы загаловак. Пачытаеш матэрыял, а паміж ім і назвай — ніякай сувязі.

Мы — гісторыкі і таму павінны мець шырокі кругагляд, свой пункт гледжання на ўсе падзеі, якія адбываюцца ў жыцці нашага грамадства. І даныя якасці ў нас ёсць. Гэта пацвердзіла і дыскусія аб культе асобы Сталіна, якая ў нейкай ступені знайшла адлюстраванне на старонках нашай газеты.

Вострыя, крытычныя выступленні членаў групы народнага кантролю. Мы не баімся крытыкаваць недахопы. Ведаем, дзякуючы гэтаму газета стане больш аўтарытэтнай.

Чыя заслуга, пытаецеся. Безумоўна, рэдактара і членаў рэдкалегіі. А яшчэ выкладчыка М. Г. Елісеева, які курыруе газету. Ён пастаянна рэдагуе артыкулы, стараецца адабраць іх так, каб адлюстроўваліся розныя, часта супрацьлеглыя меркаванні. А дзе, як не ў «насценцы», нам выказаць набалелае? Дзякуючы гэтаму мы вучымся культуры дыскусіі, уменню правільна і лагічна выкладаць свае думкі, майстэрству адстойваць уласны пункт гледжання, а часам прымаць пазіцыю субяседніка (дарэчы, гэта таксама майстэрства).

Ведаеце, мне не так важна, якое месца мы занялі, бо газета робіцца не для яго. Галоўнае, мы адчулі, што нешта можам.

І апошняе. Радуе, што студэнты самі хочуць выступіць на старонках газеты. Зазірніце ў папку рэдактара. Тут вы знойдзеце гатовыя артыкулы па розных аддзелах (а іх у газеце шэсць). Упэўнены: не кожная рэдкалегія можа пахваліцца гэтым.

Не думайце толькі, што я хачу сказаць, быццам у нас усё добра. Не, гэта не так. Часта ў газеце бывае мала фотаздымкаў (хоць і маем сваю фоталабараторыю), не заўсёды задавальняе афармленне (пастаянна стараемся выпрацаваць свой, уласны стыль), некаторыя праблемы, якія патрабуюць глыбокага аналізу, разглядаюцца павярхоўна (тут, на жаль, не хапае чыста журналісцкага майстэрства). Але мы ўпэўнены, што нам пад сілу справіцца са сваімі недахопамі.

С. ЛІТВІНЧЫК,
сакратар камітэта камсамола гістфака.

# «Калі б я была рэдактарам...»

Я ПАЗНАЁМІЛАСЯ толькі з некаторымі газетамі, прадстаўленымі на выстаўцы. Ды і не ўсе «насценкі» ёсць. Складваецца ўражанне, што тут вывешаны лепшыя. А трэба было б і тыя, якія занялі апошнія месцы.

Што кідаецца ў вочы. Калі б я была рэдактарам, то абавязкова выкарыстала б стыль афармлення газеты «Журналіст». Строгі, графічны, чорна-белы. Выдатнае спалучэнне матэрыялаў, удалая кампаноўка фотаздымкаў. Гэта і не дзіўна: газету робяць будучыя журналісты. Некаторыя прозвішчы, якія стаяць тут, можна сустрэць на старонках газет і часопісаў. Так што парадоксам было б іншае: калі б газета была першай ззаду.

А зараз што датычыць матэрыялаў. Мне спадабаўся артыкул В. Бягун «Як не баяцца начальства». Здавалася б, звычайная справаздача аб практыцы. А знойдзена ўдалая форма падачы, напісана жыва, цікава, чытаецца лёгка. Ды і тэма ўсім добра знаёмая. Перад кім аднойчы не стаяў выбар: як паступіць, каб і чалавека незаслужана не пакрыўдзіць, і каб сумленне потым не мучыла, што не хапіла прынцыповасці.

А вучэбны працэс. Мы часта скардзімся на тое, як многа нам чытаюць дысцыплін (па якіх абавязкова ў канцы семестра здаём экзамены або залікі), якія потым ніколі не спатрэбяцца (нават у плане агульнага развіцця). Але кулуарныя размовы імі і застаюцца. Журналісты ж не пабаяліся (нават сёння, пад абаронай нашай веры ў галоснасць цяжка крытыкаваць) абмеркаваць гэту праблему ў «насценцы». Прычым прама, адкрыта, аргументавана.

Надзённыя праблемы студэнцкага жыцця нядрэнна, на мой погляд, асвятляюцца ў газетах «Савецкі юрыст» (юрфак) — «Vita» (біяфак). Тут і артыкулы пра прафесійную падрыхтоўку будучых маладых спецыялістаў, і пра работу навуковых гурткоў, і матэрыялы аб дасягненнях кафедраў і асобных супрацоўнікаў.

Ж. ЗУБЧОНАК,
студэнтка ФПМ.

## СЯРДЗІТЫ ЛІСТ

# «У мяне ёсць прэтэнзіі...»

Як рэдактар (у недалёкім мінулым) газеты «Vita» я хацеў бы выказаць некаторыя прэтэнзіі да арганізатараў конкурсу насценных газет.

Пра конкурс, які прысвячаецца кожны год Дню друку, у рэдкалегіі газеты даведаліся 27 красавіка, і то выпадкова, калі палова членаў журы ўжо прагледзелі конкурсныя газеты. На наступны дзень «Vita» была ў рэдакцыі «Беларускага універсітэта». У выніку — другое месца. Па праўдзе кажучы, мы спадзяваліся на большае. Але хто вінаваты? Хто абавязаны своечасова інфармаваць рэдкалегію?

А выстаўка?! Добра, што нарэшце студэнты і выкладчыкі атрымалі магчымасць паглядзець насценкі, таму што інакш дзеля «Vita» ці «Журналіста» ніхто па філіялах не паедзе. Але арганізатары выстаўкі, а магчыма, выканаўцы, размясцілі газеты так, што прачытаць іх чалавеку сярэдняга росту можна толькі стоячы на каленях. Мне здаецца, нават самыя лепшыя газеты не заслужылі такога гонару.

Далей, пранумераваныя аркушы «Vita» былі пераблытаны, а малюнак-ілюстрацыя да гумарыстычнага расказа Нашага Супрацоўніка «адклеілася». Замест усяго навагодняга нумара вісіць толькі палавіна. А праз тыдзень-другі — зноў у «сундукі» рэдкалегій... А рэдактарам і членам рэдкалегій вельмі хацелася б ведаць думку чытачоў. Таму ў мяне паявілася такая прапанова: чаму б не арганізаваць круглагадавую выстаўку факультэцкіх насценак, прачытаюць яе за месяц-другі на «родным» факультэце, а потым няхай зойме месца на вялікім універсітэцкім стэндзе ў галоўным корпусе. Няхай тады некаму будзе сорамна за пустое месца ці наадварот — за дарэмна занятае...

Скажаце, дзе ж аператыўнасць? Але, мне здаецца, газеты не стануць менш цікавымі з-за таго, што падзеі, апісаныя ў іх, адбываліся на факультэтах месяц назад.

А вось як даведацца думку чытачоў пра газеты?

А. ВІНЧЭЎСКІ.

# Калі хочаш быць здаровым

**Памост. Гіры. Рывок... Есць! Перадышка. Рывок. Яшчэ рывок... Тры, пяць, дзесяць... Стомлены погляд, струменьчыкі поту на лбе. Твар чалавека, які выклаў усе свае сілы ў імкненні да перамогі.**

АПОШНІМІ днямі красавіка адбыўся чэмпіянат універсітэта па гіравому спорту. Праходзіў ён у спецыяльна абсталяванай для такіх спаборніцтваў зале, якая адпавядала ўсім патрабаванням. Адзін за адным падыходзілі атлеты да памосту, прынцыпова, непрадузята судзілі, назіралі за тэхнікай выканання П. Бурдыка — майстар спорту, чэмпіён рэспублікі па гіравому спорту мінулага года; В. Юрчанка — суддзя рэспубліканскай катэгорыі; С. Махноў — першаразраднік; В. Дэкман — студэнт наргаса. Галоўны суддзя спаборніцтваў — суддзя міжнароднага класа В. Ф. Кавалёў.

Ва ўпартай барацьбе вызначыліся пераможцы. Імі сталі: у вагавай катэгорыі да 60 кг — Д. Рабцэвіч (хімфак), Г. Маргалін (мехмат), А. Занько (журфак); да 70 кг — У. Квочын (ФПМ), М. Кавалёў (журфак), А. Ішчанка (геафак); да 80 кг — В. Лянгнер (мехмат), У. Лубешка (юрфак), М. Ліхадзед (мехмат); да 90 кг — В. Харанека (факультэт радыёфізікі і электронікі), А. Яцына (юрфак), В. Траскоўскі (факультэт радыёфізікі і электронікі); звыш 90 кг — А. Дабранаў, А. Заматаеў (юрфак), М. Аўраменка (геафак). Яны занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

У камандным першынстве мацнейшымі былі зборныя юрфака, мехмата, геафака.

Вось што сказаў у сувязі з чэмпіянатам галоўны суддзя В. Ф. Кавалёў:

— З кожным годам колькасць удзельнікаў павялічваецца. Сёлета іх ужо больш за сто. Гэта, безумоўна, радуе. Дарэчы, наш універсітэт нядрэнна выглядае па гэтаму віду спорту на фоне іншых ВНУ. У нас створаны добрыя ўмовы для трэніровак: ёсць зала, неабходны інвентар.

Гіравы спорт называюць мужчынскім. Гэта так. Ён выпрацоўвае вынослівасць, сілу, мужнасць, настойлівасць, мэтанакіраванасць. Так што мы чакаем вас, сапраўдныя мужчыны!

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Фота аўтара.



# СПОРТ

## Ці дробязнае пытанне?

КАЛІ НЕШТА не прадугледжана планам, ці патрэбна, каб яно было? Да нядаўняга часу вам бы адказалі, што не, спачатку план, а потым усё астатняе. Так гэта «усё астатняе» дажыло да нашага часу і зараз патрабуе вырашэння.

— А нам што рабіць цяпер, калі матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта пакідае жадаць лепшага? — заўважаць тыя, ад каго залежыць выкананне.— Пачакайце яшчэ трошкі са сваім пытаннем. Не разабраўшыся, можна каго і пакрыўдзіць незаслужана.

У ролі вось такой падчарыцы «усяго астатняга» і аказаліся ў наш час спартыўныя пакоі ў васьмі інтэрнатах БДУ. Колькасць пакояў не адпавядае колькасці інтэрнатаў. Адзін больш-менш нармальны спартыўны пакой працуе ў інтэрнаце № 6. Ды і то завезеныя туды спартыўныя трынажоры з-за недагляду пры атрыманні аказаліся рас- нядрэнна. У У інтэрнаце № 2 свой спартыўны пакой на чацвёртым паверсе, толькі акрамя тэніснага стала там нічога няма. Але і гэта яшчэ нядрэнна. У інтэрнатах №№ 3, 7, 8 і такога не маюць. Спадзяюцца, што хутка адпаведны пакой лепшы за астатнія будзе ў інтэрнаце № 4, калі скончыцца рамонт і яго абсталююць.

Сітуацыя склалася цяжкая. Калі будаваліся інтэрнаты, ні ў адным па плану спартыўныя пакоі (пра спортзалы ўжо і не кажы) не былі прадугледжаны. Зразумела, нялёгка цяпер вырашыць гэту праблему. Толькі вось існуе яна ўжо дзесяцігоддзі. І ні прафком, ні спартыўны клуб пакуль што належнай увагі да спартыўнай работы ў інтэрнатах не звяртаюць. Можна, зразумела, спаслацца на цяжкасці ў атрыманні неабходных рэчаў па безнаяўнаму разліку, на пасіўнасць саміх студэнтаў, але гэтым справу з месца не зрушыць. А рэальнага становішча са спартыўнымі пакоямі тыя, хто павінен за іх адказваць, ці то не ведаюць, ці не жадаюць выпраўляць. Шляхі да паляпшэння раяць і самі студэнты, якія зацікаўлены ў гэтым. Калі нельга нешта закупіць патрэбнае зараз для абсталявання спартыўных пакояў, чаму б не паспрабаваць зрабіць частку ў майстэрні універсітэта. Пытанне ставіцца і больш шырэй. Чаму прафком, маючы спортклуб, не мае пунктаў пракату спартыўнага інвентару ў інтэрнатах?

Здаецца, дробязныя зусім пытанні — не прадугледжаныя калісьці планам спартыўныя пакоі ў інтэрнатах.

А. МАКСІМАЎ.



ІМГНЕННЕ ВЯЛІКАГА СПОРТУ





## Спартыўны кур,ер

* * *

Скончыліся спборніцтвы сярод ВНУ рэспублікі па стральбе з лука. Упершыню спартсмены БДУ занялі трэцяе месца. Лепшымі былі Н. Зубрык (І курс, ФПМ) і Д. Скрабагатаў (2 курс, філфак). Трэніруе спартсменаў А. А. Кісялёў.

* * *

Сярод адзінаццаці каманд, што змагаліся ў сакавікумаі на першынстве універсітэта па міні-футболу, першае месца заваявала каманда юрфака, другое — факультэта радыёфізікі і электронікі, трэцяе — ФПМ.

* * *

У мінулую суботу ў фінальнай гульні за першае месца па баскетболу сустрэліся каманды БДУ і педагагічнага інстытута. Ва ўпартай барацьбе нашы спартсменкі ўступілі, заняўшы другое месца.

Трэнер зборнай універсітэта па баскетболу В. Я. Шхіньян адзначыў у гэтай гульні ўсіх дзяўчат: А. Дадычыну (юрфак), М. Мармылёву (ФПМ), А. Міхалапаву (мехмат), І. Дамарацкую (мехмат), Л. Малую (фізфак). Сярод недахопаў, якія перашкодзілі дзяўчатам падняцца на першую прыступку п'едэстала, трэнер назваў шматлікую колькасць памылак, дапушчаных у другім перыядзе. Галоўная прычына іх — стомленасць.

* * *

Сапраўдным святам для ўсіх, хто цікавіцца спартыўнай фатаграфіяй, сталі гэтыя дні. З 20 мая па 3 чэрвеня ў мінскім Палацы спорту праводзіцца сумесная савецка-амерыканская фотавыстаўка «Свет спорту». На ёй прадстаўлены цікавыя здымкі, зробленыя прызнанымі фотамайстрамі за апошняе дзесяцігоддзе.

### КРОС

## Залік і пралік

ФІНАЛ кросу першынства БДУ імя У. І. Леніна. Хто ўдзельнічаў у ім, памятае, што дыстанцыя была складанай, цяжкай: камяністыя дарожкі, крутыя пад'ёмы, павароты. Але нягледзячы на гэта рэзультаты даволі высокія.

У забегу на 500 метраў (жанчыны) першае месца заняла А. Булаўка, юрфак (1,21), другое — А. Гурыновіч, мехмат (1,31), трэцяе — Н. Жураўская, юрфак (1,31). На двухкіламетровай дыстанцыі пераможцамі сталі студэнткі ФПМ А. Ерахавец (7,24), Л. Петрашкевіч (8,03), Т. Шаўцова (8,07). А адлегласць у 100 метраў (мужчыны) хутчэй за ўсіх пераадолелі С. Богдан, юрфак (2,45), А. Загорскі, філфак (2,52) і А. Бурдыка, юрфак (2,54), заняўшыя адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

У забегу на 3000 метраў мацнейшымі былі А. Панцэвіч, гістфак (9,20), А. Гутар, фізфак (9,31), А. Каласоўскі, юрфак (9,35).

В. В. Залеская, галоўны суддзя спаборніцтваў, адзначыла добрую арганізацыю мехмата, ФПМ і асабліва юрфака. У іх хаця і адсутнічаў адзін залікові чалавек на дыстанцыі 3000 метраў, усё ж яны змаглі заняць першае агульнакаманднае месца. Другое — у ФПМ. (Дарэчы, разрыў паміж імі даволі вялікі). Трэцімі былі бегуны мехмата.

Але ёсць і нараканні. Невядома па якіх прычынах фізікі і гісторыкі не змаглі выставіць на спаборніцтвы па 25 чалавек, па якіх вёўся б залік рэзультатаў. І яшчэ. Чаму атрымалася так, што супалі двое спаборніцтваў? Літаральна праз паўгадзіны некаторыя з удзельнікаў універсітэцкага кросу павінны былі выступаць на першынстве Маскоўскага раёна па бегу. Гэта, зразумела, нялёгка. Але ўсё ж нашы спартсмены заваявалі прызавыя месцы. Толькі як яны адчувалі сябе потым пасля такой нагрузкі?

Л. ЛАРЫНА.

### А ВЫ СПРАБАВАЛІ?

## Прапануем спосаб заблудзіць

У ГЭТЫ веснавы дзень студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі чакалі незвычайныя выпрабаванні. Хоць, дзякуючы сваім прафесійным абавязкам, яны і павінны знаходзіць выхады з любых, здавалася б бязвыхадных становішчаў, аднак на гэты раз было цяжкавата з компасам і картай, а не з ручкай і паперай, адолець такі від выпрабаванняў, як спартыўнае арыентаванне. Маючы даволі павярхоўнае ўяўленне аб тым, што будзе адбывацца ў Зялёным Лузе-5, першакурснікі, якіх падбадзёрвала намеснік дэкана па спартыўнай рабоце Л. К. Артамонава, прыбылі на месца.

Убачанае крыху азадачыла: нейкія незразумелыя знакі на карце. А к старту рыхтаваліся і прафесіяналы, і аматары гэтага віду спорту. З першымі былі яшчэ і школьнікі, напрыклад, Л. Раманчык — віцэ-прэзідэнт турыстычнага клуба «Фрунзенец». Тут жа — шматкратны чэмпіён свету У. Жалудскі. На пытанне: «Чым прыцягвае вас спартыўнае прыентаванне?» абодва не загаворваючыся адказалі: «У адрозненне ад бегу тут працуюць не толькі мышцы, але і галава. Гэта спорт, дзе трэба думаць. Акрамя таго, бег па лесе выгадна адрозніваецца ад бегу па стадыёну: тут можна палюбавацца прыродай, падыхаць свежым паветрам».

А вось пытанне, якое пастаянна хвалюе пачынаючых: «Ці праўда, што пайсці ў лес з компасам і ёсць навуковы спосаб заблудзіць?». У. Жалудскі прыняў яго як жарт, а яго малады калега запэўніў, што тут існуе пэўная колькасць памылак, на якіх вучацца.

Хутка студэнтам сталі зразумелыя невядомыя раней знакі. Іх расшыфраваў галоўны суддзя С. Ф. Рыжанкоў. Ён жа растлумачыў і ўмовы спаборніцтва, пазнаёміў з гісторыяй гэтага віду спаборніцтваў, якія першы раз прайшлі ў 1972 годзе.

Дадзены старт. Пабегла стрэлка секундамера. Жыццё на лясной паляне ішло сваім шляхам: прыбывалі на фініш і адыходзілі са старту ўдзельнікі. Размаўлялі паміж сабой аўтары першай у краіне кнігі па гэтаму віду спорту «Асновы тэхнікі і тактыкі спартыўнага арыентавання» Н. А. Сінажэўскі, А. А. Кудрашоў, В. Г. Акімаў.

Бяжыць стрэлка секундамера. Вось і першыя журфакаўцы. Лепшымі аказаліся Ларыса Бандарэнка і Ларыса Цімошык, якія першымі знайшлі ўсе шэсць кантрольных пунктаў. З рабят першым свой аўтограф на дзесяці кантрольных пунктах пакінуў С. Бабак. Агульныя вынікі аказаліся нават крыху нечаканымі: ніхто не заблудзіў, ды і на фініш прыйшлі ў вызначаны час.

Што ж дала ўдзельнікам гэта прагулка па лесе? Па-першае, сталі зразумелымі незразумелыя знакі, а самае галоўнае — яны атрымалі добры зарад бадзёрасці і выдатнага настрою.

І. ГЕЦЭВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
26 мая
Зак. 1624.



220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.



В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.